УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
"БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ МАКСІМА ТАНКА"

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
____________ А.В. Макоўчык
"___" ______________ 2022 г.

Рэгістрацыйны № УД 31-1-15-2022/уч.

# ЛІТАРАТУРНАЕ РЭДАГАВАННЕ

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці**
**1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура**

2022 г.

Вучэбная праграма распрацавана на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі АСВА 1-02 03 01-2021, тыпавой вучэбнай праграмы "Літаратурнае рэдагаванне", зацверджанай __________, рэгістрацыйны нумар __________, і вучэбных планаў 1-02 03 01 "Беларуская мова і літаратура"

**СКЛАДАЛЬНІК:**

Н. В. Заяц, дацэнт кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

І. Д. Воюш, дацэнт кафедры кафедры медыялогіі факультэта журналістыкі БДУ, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

В. В. Урбан, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**УЗГОДНЕНА:**

Дырэктар
ДУА "Сярэдняя школа № 191 г. Мінска" __________ Ю. І. Пінчук

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
(пратакол № 10 ад 10 мая 2022 г.)

Загадчык кафедры
__________ І. М. Мінчанчук

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
(пратакол № 7 ад 21 чэрвеня 2022 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае
Метадыст вучэбна-метадычнага аддзела БДПУ __________ Я. В. Ціханава

Дырэктар бібліятэкі __________ Н. П. Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна “Літаратурнае рэдагаванне” дае ўяўленне пра творчую работу рэдактара па ўдасканаленні і падрыхтоўцы да публікацыі аўтарскага рукапісу. Уменне граматна, дакладна, лагічна фармуляваць і выкладаць свае думкі патрэбнае не толькі настаўніку-філолагу, але і любому адукаванаму чалавеку. Філалагічная адукацыя з’яўляецца добрым падмуркам для набыцця спецыфічных рэдактарскіх уменняў і навыкаў. Кваліфікаваны рэдактар павінен ведаць тэарэтычныя аспекты рэдактарскай работы і валодаць методыкай рэдагавання матэрыялу, ажыццяўляць розныя віды праўкі, умець карыстацца знакамі праўкі. Веды, уменні і навыкі, набытыя ў працэсе вывучэння дысцыпліны, будуць карыснымі і неабходнымі ў прафесійнай дзейнасці філолага, а таксама спатрэбяцца падчас вучобы ва ўстанове вышэйшай адукацыі – пры напісанні і афармленні рэфератаў, кантрольных, курсавых і дыпломных работ.

***Мэта*** выкладання і вывучэння дысцыпліны – азнаямленне студэнтаў з тэарэтычнымі пытаннямі літаратурнага рэдагавання, выпрацоўка практычных навыкаў работы з тэкстам.

***Задачы*** вучэбнай дысцыпліны – навучыць студэнтаў

- праводзіць рэдактарскі аналіз і ажыццяўляць розныя віды рэдактарскай праўкі;
- валодаць методыкай рэдагавання;
- удасканальваць кампазіцыю, лагічна-сэнсавую арганізацыю, лексіка-стылістычнае афармленне тэксту;
- ажыццяўляць рэдактарскую праўку тэкстаў розных стыляў і жанраў.

***Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста, сувязі з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі.*** Згодна з вучэбным планам па спецыяльнасці 1-02 03 01 “Беларуская мова і літаратура” вучэбная дысцыпліна “Літаратурнае рэдагаванне” ўваходзіць у дзяржаўны кампанент і з’яўляецца часткай модуля “Літаратурнае рэдагаванне і крытыка”. “Літаратурнае рэдагаванне” выкладаецца студэнтам 2 курса філалагічнага факультэта ў якасці адной з дысцыплін прафесійнай падрыхтоўкі настаўніка-філолага.

Вывучэнне дысцыпліны “Літаратурнае рэдагаванне” базіруецца на агульналінгвістычных ведах, атрыманых студэнтамі ў працэсе засваення вучэбнай дысцыпліны “Практыкум па беларускай мове”, які ўваходзіць у дзяржаўны кампанент для спецыяльнасці 1–02 03 01 “Беларуская мова і літаратура”. Пры вывучэнні некаторых тэм выкарыстоўваюцца мастацкія тэксты беларускіх пісьменнікаў, творчасць якіх разглядаецца ў межах вучэбнай дысцыпліны “Гісторыя беларускай літаратуры XIX ст.”.

***Патрабаванні да засваення вучэбнай дысцыпліны.*** Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Літаратурнае рэдагаванне” павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў кампетэнцыі БПК-16 (спецыяльнасць 1–02 03 01 “Беларуская мова і літаратура”): прымяняць методыку рэдагавання, праводзіць рэдактарскі аналіз і ажыццяўляць розныя віды рэдактарскай праўкі тэксту.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен ***ведаць***:

– асаблівасці працы рэдактара і нормы прафесійнай этыкі;

– спецыфіку, мэты і задачы рэдактарскага аналізу;

– агульныя прынцыпы і крытэрыі ацэнкі рукапісу;

– метадалогію рэдактарскай працы над тэкстам.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен ***умець***:

– праводзіць рэдактарскі аналіз і ажыццяўляць розныя віды праўкі;

– прымяняць законы логікі з мэтай удасканалення матэрыялу, паляпшэння яго зместу і кампазіцыі;

– ліквідаваць памылкі і недагляды ў моўным, стылявым, граматычным афармленні тэксту.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен ***валодаць***:

– методыкай аналізу мовы і стылю твора;

– лагічнымі асновамі рэдагавання;

– тэхнікай рэдактарскай праўкі;

– адпаведным паняційным і тэрміналагічным апаратам.

Па кожнай вучэбнай тэме ў адпаведнасці з яе мэтамі і задачамі па фарміраванні і развіцці ў студэнтаў канкрэтных кампетэнцый выкладчык праектуе і рэалізуе канкрэтныя педагагічныя тэхналогіі.

*Асноўнымі тэхналогіямі навучання з’яўляюцца*: праблемнае навучанне (праблемнае выкладанне, пошукавы метад); камунікатыўныя тэхналогіі, заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання; асобасна арыентаваная тэхналогія (улік індывідуальна-асобасных асаблівасцей студэнтаў, захаванне прынцыпу варыятыўнасці); інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі (мультымедыйныя прэзентацыі, online-тэсты, інтэрактыўныя заданні ў сістэмах дыстанцыйнага навучання, электронныя бібліятэкі, спецыялізаваныя сайты і інш.).

*Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў.* Пры вывучэнні дысцыпліны “Літаратурнае рэдагаванне” выкарыстоўваюцца такія формы самастойнай работы, як выкананне індывідуальных заданняў на практычных занятках пад кантролем выкладчыка, выкананне індывідуальных заданняў пазааўдыторна, інтэрактыўных заданняў у сістэмах дыстанцыйнага навучання і інш.

***Агульная колькасць гадзін, колькасць аўдыторных гадзін, форма атрымання вышэйшай адукацыі, размеркаванне аўдыторных гадзін, формы бягучай атэстацыі.*** Вывучэнне дысцыпліны “Літаратурнае рэдагаванне” разлічана на 100 вучэбных гадзін. З іх 50 аўдыторных гадзін: 24 лекцыйных, 26 практычных. Форма атрымання адукацыі – дзённая, курс – 2.

Размеркаванне гадзін па семестрах:

| *Семестр* | *Усяго* | *Лекцыі* | *Практычныя* | *Самастойная работа студэнтаў* | *Форма кантролю* |
|---|---|---|---|---|---|
| III | 100 | 24 | 26 | 50 | Экзамен |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

**Тэма 1. Літаратурнае рэдагаванне як вучэбная дысцыпліна**

Мэты і задачы літаратурнага рэдагавання як вучэбнай дысцыпліны. Сутнасць паняцця “літаратурнае рэдагаванне”. Станаўленне літаратурнага рэдагавання. Сувязь з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі.

**Тэма 2. Рэдактар і тэкст**

Асноўныя характарыстыкі тэксту. Псіхалагічныя перадумовы праўкі тэксту. Асаблівасці рэдактарскага чытання. Адрозненне рэдактарскага чытання ад навуковага. Віды рэдактарскага чытання. Задачы літаратурнага рэдагавання. Стратэгіі літаратурнага рэдагавання. Адзнакі на палях – дзейсны сродак дапамогі рэдактара аўтару. Спецыфіка прафесіі рэдактара. Рэдактарская этыка.

**Тэма 3. Лагічныя асновы рэдагавання тэксту**

Сэнсавы аналіз тэксту. Асноўныя аперацыі пры лагічным аналізе матэрыялу (падзел тэксту на часткі; даследаванне сувязей паміж часткамі, паміж сэнсавымі адзінкамі тэксту і рэчаіснасцю). Прымяненне асноўных законаў логікі (законы тоеснасці, супярэчнасці, выключанага трэцяга, дастатковага абгрунтавання).

Кампазіцыйная арганізацыя тэкставага матэрыялу. Рэдактарская праца над кампазіцыяй тэксту. Тыповыя кампазіцыйныя памылкі і методыка іх выпраўлення. Складанне рабочага плана рукапісу, ацэнка і ўдасканаленне рубрыкацыі аўтарскага тэксту.

**Тэма 4. Асновы рэдактарскага аналізу тэксту**

***Падтэма 4.1. Рэдактарскі аналіз тэксту. Праца рэдактара над тэмай і загалоўкам***

Сутнасць паняцця “рэдактарскі аналіз тэксту”. Мэта і задачы рэдактарскага аналізу. Два аспекты працы рэдактара над рукапісам: аналіз і практычная рэалізацыя яго вынікаў. Літаратурная крытыка і рэдактарскі аналіз: агульнае і адрознае. Спецыфічныя асаблівасці рэдактарскага аналізу. Асэнсаванне прыёмаў і метадаў працы аўтара, арыентацыя на чытацкае ўспрыняцце, разгляд тэксту як адзінага цэлага, улік відавых, жанравых асаблівасцей твора.

Распрацоўка тэмы. Актуальнасць і арыгінальнасць – асноўныя крытэрыі рэдактарскай ацэнкі тэмы. Агульныя патрабаванні да загалоўкаў: адпаведнасць зместу, дакладнасць, яснасць, лаканічнасць, арыгінальнасць. Шаблонныя і трафарэтныя загалоўкі. Загалоўкі ў мастацкай і навуковай літаратуры. Загаловачны комплекс у друкаваных СМІ. Прыёмы стварэння загалоўкаў. Праца рэдактара па ўдасканаленні загалоўка.

***Падтэма 4.2. Фактычны матэрыял і яго праверка***

Паняцце “фактычны матэрыял” у рэдакцыйна-выдавецкай практыцы. Задачы рэдактарскага аналізу фактаў: ацэнка іх якасці, устанаўленне

правільнасці, дакладнасці прыведзеных дадзеных. Прычыны фактычных недакладнасцей. Асноўныя віды праверкі фактычнага матэрыялу: зверка фактаў з аўтарытэтнай крыніцай, унутраная праверка, афіцыйнае пацвярджэнне. Рэдагаванне ўласных імёнаў, геаграфічных назваў, дат. Захаванне прынцыпу аднастайнасці.

Цытаты і цытаванне. Ілюстрацыйныя і аналітычныя цытаты. Прычыны памылак пры цытаванні. Тэхніка праверкі цытат. Спосабы ўвядзення і афармлення цытат. Знакі прыпынку пры цытатах.

***Падтэма 4.3. Моўна-стылявая праўка тэксту***

Крытэрыі рэдактарскай ацэнкі мовы і стылю: адпаведнасць тэме, ідэі, зместу твора, даступнасць для пэўнай катэгорыі чытачоў, дакладнасць і яснасць мовы, сціслась, жывасць, выразнасць, яркасць выкладання. Праблема моўнай нормы. Пытанне пра парушэнне нормы ў тэксце. Моўныя стандарты і клішэ. Улік рэдактарам асноўных патрабаванняў да тэксту (дарэчнасць, даступнасць, правільнасць, чысціня, дакладнасць, лагічнасць, багацце, выразнасць, мілагучнасць). Паронімы. Канцылярызмы і штампы. Прычыны ўзнікнення канцылярызмаў і штампаў, іх асноўныя прыкметы, разнавіднасці. Плеаназм і таўталогія. Прынцып мэтазгоднасці ў адборы моўна-стылявых сродкаў. Увага рэдактара да фанетычнага афармлення тэксту. Захаванне прынцыпу мілагучнасці.

Граматычна-стылявая праўка. Асноўныя віды граматычных памылак. Граматычная варыянтнасць.

Сінтаксічная праўка. Беднасць і аднастайнасць сінтаксічных канструкцый у аўтарскім тэксце. Рэдактарская праца па ўдасканаленні сінтаксічнага афармлення матэрыялу.

**Тэма 5. Рэдактарская праўка і яе віды**

Этапы працы над рукапісам. Літаратурная апрацоўка рукапісу ў газеце і ў выдавецтве. Задачы рэдактарскай праўкі. Парадак выпраўлення рукапісу: успрыняцце – крытыка – карэктывы. Асноўныя правілы выпраўлення тэксту.

Праўка-вычытка. Мэты, задачы, тэхніка правядзення, віды тэкстаў. Абавязкі рэдактара пры гэтым відзе працы.

Праўка-скарачэнне, яе тыпы. Віды і характарыстыкі тэкстаў. Спосабы ажыццяўлення праўкі-скарачэння.

Праўка-апрацоўка. Мэты, задачы, асноўныя прыёмы правядзення.

Праўка-перапрацоўка і літаратурны запіс. Задачы праўкі-перапрацоўкі. Захаванне мовы, стылю, манеры аўтара пры праўцы-перапрацоўцы і літаратурным запісе.

Сінтэтычная праўка. Узаемасувязь відаў праўкі.

Выдавецкая праўка. Спецыфіка выдавецкай праўкі. Прычыны, якія выклікаюць выдавецкую праўку.

**Тэма 6. Знакі рэдактарскай праўкі**

Тэхніка рэдактарскай праўкі тэксту. Карэктурныя (карэктарскія) знакі. Знакі замены (адной ці некалькіх літар, слова, вялікай літары на малую, малой

літары на вялікую, працяжніка на дэфіс, дэфіса на працяжнік). Знакі выкідкі (літары, сімвала, слова або некалькіх слоў, некалькіх радкоў). Знакі ўстаўкі (літары, некалькіх літар, сімвала, слова, некалькіх слоў). Знакі перастаноўкі (суседніх літар, складоў, слоў; двух слоў ці груп слоў у межах старонкі; частак тэксту з адной старонкі на іншую). Знакі прабелаў (устаўкі або ліквідацыі прабела). Знакі выключэння радкоў (набору з чырвонага радка, у падбор, па цэнтры). Знакі шрыфтавых вылучэнняў. Знак адмены зробленага выпраўлення.

**Тэма 7. Рэдагаванне тэкстаў розных тыпаў**

Праца рэдактара па ўдасканаленні тэкстаў розных тыпаў. Спецыфіка пабудовы апавядальных канструкцый. Асаблівасці апісанняў. Схема апісання. Разважанні. Спосабы размяшчэння матэрыялу ў разважаннях (аналітычны і сінтэтычны). Складаныя разважанні. Віды аргументаў у разважаннях. Азначэнні ў тэкстах розных тыпаў. Аналітычныя і сінтэтычныя дэфініцыі. Правілы пабудовы аналітычных дэфініцый. Спосабы ўключэння дэфініцый у тэкст.

**Тэма 8. Рэдагаванне тэкстаў featuresрознай стылявой і жанравай прыналежнасці**

Функцыянальны стыль. Стылістычная норма. Адрозненне паняццяў “стыль” і “жанр”. Праца рэдактара над тэкстамі навуковага стылю. Спецыфіка рэдагавання манаграфіі, навуковага артыкула, анатацыі. Праца рэдактара над тэкстамі публіцыстычнага стылю. Некаторыя прыёмы літаратурнай праўкі нататкі, рэпартажу, інтэрв’ю, нарыса, чытацкіх лістоў. Тыповыя памылкі аўтараў-пачаткоўцаў. Праца рэдактара над тэкстамі афіцыйна-дзелавога стылю. Спецыфіка рэдагавання рэзюмэ.

**Тэма 9. Рэдагаванне апарату кнігі**

Агульная характарыстыка апарату кнігі. Рэдагаванне прадмоў, пасляслоўяў, анатацый. Рэдактарская праца з каментарыямі і заўвагамі. Віды паказальнікаў. Рэдактарскія патрабаванні да паказальнікаў.

**Тэма 10. Афармленне і рэдагаванне бібліяграфіі**

Асноўныя часткі бібліяграфічнага апарату: бібліяграфічныя спасылкі і спіс выкарыстанай літаратуры. Унутрытэкставыя, падрадковыя, затэкставыя бібліяграфічныя спасылкі.

Спіс выкарыстанай літаратуры. Прынцыпы групавання крыніц. Абавязковыя і факультатыўныя элементы бібліяграфічнага апісання. Элементы апісання, абавязковыя для афармлення бібліяграфій у студэнцкіх даследаваннях (рэфератах, курсавых і дыпломных работах). Афармленне і рэдагаванне аналітычных бібліяграфічных апісанняў.

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА**
**ДЫСЦЫПЛІНЫ “ЛІТАРАТУРНАЕ РЭДАГАВАННЕ”**
**(дзённая форма атрымання адукацыі)**

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Самастойная работа студэнта | Матэрыяльнае забеспячэнне занiткаў | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семінарскія заняткі | | | | |
| 1 | 2 | | | | | | |
| | **ЛІТАРАТУРНАЕ РЭДАГАВАННЕ** | **24** | **26** | **50** | | | |
| **1.** | **Літаратурнае рэдагаванне як вучэбная дысцыпліна** | **2** | | | | | |
| 1.1. | Літаратурнае рэдагаванне як вучэбная дысцыпліна.<br>1. Мэты і задачы літаратурнага рэдагавання як вучэбнай дысцыпліны.<br>2. Сутнасць паняцця “літаратурнае рэдагаванне”.<br>3. Станаўленне літаратурнага рэдагавання.<br>4. Сувязь з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі. | 2 | | 2 | ЭВМК “Літаратурнае рэдагаванне” | [2]<br>[3]<br>[9] | |
| **2.** | **Рэдактар і тэкст** | **2** | | **2** | | | |
| 2.1. | Рэдактар і тэкст.<br>1. Асноўныя характарыстыкі тэкту.<br>2. Псіхалагічныя перадумовы праўкі тэксту.<br>3. Асаблівасці рэдактарскага чытання. Адрозненне рэдактарскага чытання ад навуковага.<br>4. Віды рэдактарскага чытання.<br>5. Спецыфіка прафесіі рэдактара. Рэдактарская этыка. | 2 | | 2 | ЭВМК “Літаратурнае рэдагаванне” | [2]<br>[3]<br>[8]<br>[9] | |
| **3.** | **Лагічныя асновы рэдагавання тэксту** | **2** | **6** | **8** | | | |
| 3.1. | Лагічныя асновы рэдагавання тэксту.<br>1. Прымяненне асноўных законаў логікі.<br>2. Кампазіцыйная арганізацыя тэкставага матэрыялу. | 2 | | 2 | ЭВМК “Літаратурнае рэдагаванне” | [2]<br>[3]<br>[8] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3.1.1. | Выпраўленне лагічных памылак. | | 2 | 2 | ЭВМК “Літаратурнае рэдагаванне” | [2] | Рэдагаванне тэкстаў. |
| 3.1.2. | Лагічна-сэнсавае рэдагаванне тэксту. | | 2 | 2 | ЭВМК “Літаратурнае рэдагаванне” | [2] | Рэдагаванне тэкстаў. |
| 3.1.3. | Удасканаленне кампазіцыі тэксту. | | 2 | 2 | ЭВМК “Літаратурнае рэдагаванне” | [2] | Рэдагаванне тэкстаў. |
| **4.** | **Асновы рэдактарскага аналізу тэксту** | **6** | **8** | **12** | | | |
| 4.1. | Рэдактарскі аналіз тэксту. Праца рэдактара над тэмай і загалоўкам.<br>1. Задачы рэдактарскага аналізу.<br>2. Распрацоўка тэмы.<br>3. Патрабаванні да загалоўкаў. | 2 | | 2 | ЭВМК “Літаратурнае рэдагаванне” | [2]<br>[3]<br>[8]<br>[9] | |
| 4.1.1. | Праца рэдактара над тэмай і загалоўкам. | | 2 | 2 | ЭВМК “Літаратурнае рэдагаванне” | [2] | Рэдагаванне тэкстаў. |
| 4.2. | Фактычны матэрыял і яго праверка.<br>1. Асноўныя віды праверкі фактычнага матэрыялу.<br>2. Цытаты і цытаванне. Тэхніка праверкі цытат. | 2 | | 2 | ЭВМК “Літаратурнае рэдагаванне” | [2]<br>[3]<br>[8]<br>[9] | |
| 4.2.1. | Аналіз, ацэнка і рэдагаванне фактычнага матэрыялу. | | 2 | 2 | ЭВМК “Літаратурнае рэдагаванне” | [2] | Рэдагаванне тэкстаў. |
| 4.3. | Моўна-стылявая праўка тэксту.<br>1. Крытэрыі рэдактарскай ацэнкі мовы і стылю.<br>2. Граматычна-стылявая праўка.<br>3. Сінстаксічная праўка. | 2 | | 2 | Прэзентацыя № 1, ЭВМК “Літаратурнае рэдагаванне” | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[12] | |
| 4.3.1. | Моўна-стылявая праўка тэксту. | | 2 | 2 | ЭВМК “Літаратурнае рэдагаванне” | [1]<br>[2]<br>[11] | Рэдагаванне тэкстаў. |
| 4.3.2. | Сінтаксічная праўка тэксту. | | 2 | | ЭВМК “Літаратурнае рэдагаванне” | [1]<br>[2] | Рэйтынгавая кантрольная работа № 1. |
| **5.** | **Рэдактарская праўка і яе віды** | **2** | **2** | **6** | | | |
| 5.1. | Рэдактарская праўка і яе віды.<br>1. Праўка-вычытка.<br>2. Праўка-скарачэнне.<br>3. Праўка-апрацоўка.<br>4. Праўка-перапрацоўка.<br>5. Методыка правядзення розных відаў рэдактарскай праўкі. Сінтэтычная праўка тэксту. | 2 | | 2 | ЭВМК “Літаратурнае рэдагаванне” | [2]<br>[3]<br>[8]<br>[9] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 5.1.1. | Віды рэдактарскай праўкі.<br>1. Праўка-вычытка.<br>2. Праўка-скарачэнне.<br>3. Праўка-апрацоўка.<br>4. Праўка-перапрацоўка.<br>5. Методыка правядзення розных відаў рэдактарскай праўкі. Сінтэтычная праўка тэксту. | | 2 | 4 | ЭВМК “Літаратурнае рэдагаванне” | [2]<br>[4] | Рэдагаванне тэкстаў. |
| **6.** | **Знакі рэдактарскай праўкі** | **2** | **2** | **4** | | | |
| 6.1. | Знакі рэдактарскай праўкі.<br>1. Тэхніка рэдактарскай праўкі тэксту.<br>2. Карэктурныя (карэктарскія) знакі.<br>3. Знакі замены, выкідкі, устаўкі, перастаноўкі, прабелаў, выключэння радкоў, шрыфтавых вылучэнняў. Знак адмены зробленага выпраўлення. | 2 | | 2 | Прэзентацыя № 2, ЭВМК “Літаратурнае рэдагаванне” | [2]<br>[9] | |
| 6.1.1. | Знакі рэдактарскай праўкі. | | 2 | 2 | ЭВМК “Літаратурнае рэдагаванне” | [2] | Рэдагаванне тэкстаў. |
| **7.** | **Рэдагаванне тэкстаў розных тыпаў** | **2** | **4** | **6** | | | |
| 7.1. | **Рэдагаванне тэкстаў розных тыпаў**<br>1. Спецыфіка пабудовы апавядальных канструкцый.<br>2. Асаблівасці апісанняў. Схема апісання.<br>3. Разважанні. Спосабы размяшчэння матэрыялу ў разважаннях. | 2 | | 2 | ЭВМК “Літаратурнае рэдагаванне” | [2]<br>[3]<br>[4] | |
| 7.1.1. | Рэдагаванне тэкстаў розных тыпаў. | | 2 | 2 | ЭВМК “Літаратурнае рэдагаванне” | [2] | Рэдагаванне тэкстаў. |
| 7.1.2. | Рэдагаванне і напісанне анатацый да студэнцкіх навуковых даследаванняў. | | 2 | 2 | ЭВМК “Літаратурнае рэдагаванне” | [2] | Рэйтынгавая кантрольная работа № 2. |
| **8.** | **Рэдагаванне тэкстаў living рознай стылявой і жанравай прыналежнасці** | **2** | **2** | **4** | | | |
| 8.1. | Рэдагаванне тэкстаў рознай стылявой і жанравай прыналежнасці.<br>1. Праца рэдактара над тэкстамі навуковага стылю.<br>2. Праца рэдактара над тэкстамі публіцыстычнага стылю.<br>3. Праца рэдактара над тэкстамі афіцыйна-дзелавога стылю. | 2 | | 2 | ЭВМК “Літаратурнае рэдагаванне” | [3]<br>[4]<br>[5]<br>[6]<br>[7] | |
| 8.1.1. | Рэдагаванне тэкстаў рознай стылявой і жанравай прыналежнасці. | | 2 | 2 | ЭВМК “Літаратурнае рэдагаванне” | [2] | Рэдагаванне тэкстаў. |
| **9.** | **Рэдагаванне апарату кнігі** | **2** | | **2** | | | |
| 9.1. | Рэдагаванне апарату кнігі.<br>1. Агульная характарыстыка апарату кнігі.<br>2. Рэдагаванне прадмоў, пасляслоўяў, анатацый.<br>3. Рэдактарская праца з каментарыямі і заўвагамі.<br>4. Віды паказальнікаў. Рэдактарскія патрабаванні да паказальнікаў. | 2 | | 2 | ЭВМК “Літаратурнае рэдагаванне” | [2]<br>[3] | |
| **10.** | **Афармленне і рэдагаванне бібліяграфіі** | **2** | **2** | **4** | | | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 10.1. | Афармленне і рэдагаванне бібліяграфіі.<br>1. Асноўныя часткі бібліяграфічнага апарату.<br>2. Унутрытэкставыя, падрадковыя, затэкставыя бібліяграфічныя спасылкі. | 2 | | 2 | ЭВМК “Літаратурнае рэдагаванне” | [2]<br>[3] | |
| 10.1.1. | Афармленне і рэдагаванне бібліяграфіі.<br>1. Рэдагаванне бібліяграфічных апісанняў.<br>2. Афармленне бібліяграфіі да курсавой работы. | | 2 | 2 | Образцы оформления библиографического описания в списке источников, приводимых в диссертации и автореферате [Электронный ресурс] // ВАК Беларуси. – Режим доступа: http://vak.org.by/bibliographicDescription. – Дата доступа: 05.05.2022. | [2]<br>[10] | Рэдагаванне бібліяграфіі. |
| | **Усяго 100** | **24** | **26** | **50** | | | **Экзамен** |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура:**

1. Жаўняровіч, П. Даведнік па літаратурнай праўцы: арфаграфічны, пунктуацыйны, лексічны, граматычны, сінтаксічны, тэхнічны ўзроўні / П. Жаўняровіч ; уступн. слова В. Іўчанкава ; пад. рэд. В. Іўчанкава. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2017. – 448 с.

2. Заяц, Н. В. Літаратурнае рэдагаванне : элетронны вучэб.-метад. комплекс для спец. 1-02 03 01 “Беларус. мова і літ.” [Электронны рэсурс] / Н. В. Заяц. – Мінск : БДПУ, 2019. – Рэжым доступу: https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=2383. – Дата доступу: 25.04.2022.

3. Петрова, Л. И. Основы редактирования: системный подход в деятельности редактора : учеб. пособие / Л. И. Петрова. – Минск : Букмастер, 2012. – 384 с.

4. Петрова, Л. И. Редактирование текстов разных стилей : учеб. пособие / Л. И. Петрова. – Минск : Респ. ин-т высш. шк., 2014. – 342 с.

**Дадатковая літаратура:**

5. Жаўняровіч, П. П. Стылістыка дзелавога маўлення і рэдагаванне службовых дакументаў : вучэб. дапам. / П. П. Жаўняровіч. – Мінск : Рэсп. ін-т пед. адукацыі, 2014. – 276 с.

6. Іўчанкаў, В. І. Дыскурс беларускіх СМІ. Арганізацыя публіцыстычнага тэксту / В. І. Іўчанкаў. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2003. – 257 с.

7. Каўрус, А. А. Да свайго слова. Пытанні культуры мовы / А. А. Каўрус ; пад агул. рэд. У. І. Куліковіча – Мінск : Рэсп. ін-т вышэйш. шк., 2011. – 344 с.

8. Мильчин, А. Э. Методика редактирования текста / А. Э. Мильчин. – 3-е изд., перераб. и доп. – М. : Логос, 2011. – 524 с.

9. Накорякова, К. М. Справочник по литературному редактированию для работников средств массовой информации / К. М. Накорякова. – М. : Флинта : Наука, 2010. – 200 с.

10. Образцы оформления библиографического описания в списке источников, приводимых в диссертации и автореферате [Электронный ресурс] // ВАК Беларуси. – Режим доступа: http://vak.org.by/bibliographicDescription. – Дата доступа: 25.04.2022.

11. Розенталь, Д. Э. Справочник по правописанию и литературной правке / Д. Э. Розенталь ; под ред. И. Б. Голуб. – 20-е изд. – М. : Айрис-пресс, 2016. – 368 с.

12. Цікоцкі, М. Я. Стылістыка тэксту : вучэб. дапам. / М. Я. Цікоцкі. – Мінск : Беларус. навука, 2002. – 223 с.

# ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ПЫТАННЯЎ ДА ЭКЗАМЕНУ

1. Літаратурнае рэдагаванне як вучэбная дысцыпліна. Мэты, задачы, напрамкі станаўлення.
2. Рэдактар і тэкст. Асноўныя характарыстыкі тэксту. Псіхалагічныя перадумовы праўкі тэксту.
3. Асаблівасці і віды рэдактарскага чытання.
4. Спецыфіка прафесіі рэдактара. Рэдактарская этыка.
5. Лагічныя асновы рэдагавання тэксту. Асноўныя аперацыі пры лагічным аналізе матэрыялу.
6. Сэнсавы аналіз тэксту. Прымяненне рэдактарам асноўных законаў логікі.
7. Ацэнка кампазіцыйных прыёмаў у тэксце. Праца рэдактара над планам рукапісу.
8. Рэдактарская праца над кампазіцыяй тэксту. Тыповыя кампазіцыйныя памылкі і методыка іх выпраўлення.
9. Сутнасць паняцця “рэдактарскі аналіз тэксту”. Мэта, задачы, спецыфічныя асаблівасці рэдактарскага аналізу.
10. Літаратурная крытыка і рэдактарскі аналіз: агульнае і адрознае.
11. Праца рэдактара над тэмай і загалоўкам. Агульныя патрабаванні да загалоўкаў.
12. Загалоўкі ў мастацкай і навуковай літаратуры. Загаловачны комплекс у друкаваных СМІ.
13. Паняцце “фактычны матэрыял” у рэдакцыйна-выдавецкай практыцы. Задачы рэдактарскага аналізу фактаў.
14. Асноўныя віды праверкі фактычнага матэрыялу.
15. Цытаты і цытаванне. Тэхніка праверкі цытат. Спосабы ўвядзення і афармлення цытат.
16. Крытэрыі рэдактарскай ацэнкі мовы і стылю. Разуменне рэдактарам паняцця “чысціня мовы”.
17. Улік рэдактарам асноўных патрабаванняў да тэксту.
18. Праблема моўнай нормы. Моўныя стандарты і клішэ. Плеаназмы і таўталогія.
19. Граматычна-стылявая праўка. Асноўныя віды граматычных памылак. Граматычная варыянтнасць.
20. Сінтаксічная праўка. Рэдактарская праца па ўдасканаленні сінтаксічнага афармлення матэрыялу.
21. Рэдактарская праўка і яе віды: агульная характарыстыка.
22. Праўка-вычытка. Мэты, задачы, тэхніка правядзення.
23. Праўка-скарачэнне, яе тыпы. Спосабы ажыццяўлення праўкі-скарачэння.
24. Праўка-апрацоўка. Мэты, задачы, асноўныя прыёмы правядзення.
25. Праўка-перапрацоўка і літаратурны запіс. Методыка іх правядзення.
26. Сінтэтычная праўка. Узаемасувязь відаў праўкі.
27. Спецыфіка выдавецкай праўкі.
28. Карэктарская і рэдактарская праўка. Карэктурныя знакі.

29. Праца рэдактара па ўдасканаленні тэкстаў розных тыпаў. Спецыфіка рэдагавання апісанняў і апавяданняў.
30. Асаблівасці рэдагавання разважанняў. Правілы пабудовы аналітычных дэфініцый.
31. Функцыянальны стыль. Стылістычная норма. Адрозненне паняццяў "стыль" і "жанр".
32. Методыка рэдагавання тэкстаў у залежнасці ад стылю і жанру.
33. Праца рэдактара над тэкстамі навуковага стылю.
34. Праца рэдактара над тэкстамі публіцыстычнага стылю.
35. Праца рэдактара над тэкстамі афіцыйна-дзелавога стылю.
36. Агульная характарыстыка апарату кнігі.
37. Рэдагаванне прадмоў, пасляслоўяў, анатацый.
38. Праца рэдактара з каментарыямі і заўвагамі. Рэдактарскія патрабаванні да паказальнікаў.
39. Асноўныя часткі бібліяграфічнага апарату, іх характарыстыка.
40. Спіс выкарыстанай літаратуры. Прынцыпы групавання крыніц.

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Самастойная работа студэнтаў па дысцыпліне "Літаратурнае рэдагаванне" прадугледжвае выкананне кантрольных работ, рэферыраванне і анатаванне прафесійна арыентаваных тэкстаў, азнаямленне з даведачнай літаратурай (слоўнікамі розных тыпаў), вучэбнымі дапаможнікамі па тэорыі і практыцы рэдагавання, культуры маўлення і стылістыцы, аналіз тэкстаў розных стыляў і жанраў з пазіцыі рэдактара.

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ КАМПЕТЭНЦЫЙ СТУДЭНТАЎ

Для бягучага кантролю і самакантролю ведаў і ўменняў студэнтаў па дысцыпліне "Літаратурнае рэдагаванне" можна выкарыстоўваць наступны дыягнастычны інструментарый:

– правядзенне прамежкавых апытанняў па асобных тэмах;
– правядзенне тэсціравання па асобных тэмах;
– індывідуальная здача (веданне знакаў рэдактарскай праўкі);
– правядзенне рэдактарскай праўкі тэкстаў розных стыляў і жанраў (выпраўленне моўна-стылявых, граматычных, лагічных памылак, недахопаў у сінтаксічнай арганізацыі матэрыялу і інш.);
– падбор і афармленне бібліяграфічных спісаў па канкрэтнай тэме (індывідуальныя заданні);
– рэдагаванне бібліяграфічных спісаў (індывідуальныя заданні).

## ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ І КАНТРОЛЬНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

| № п/п | Назва тэмы | Колькасць гадзін на СРС | Заданні | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Літаратурнае рэдагаванне як вучэбная дысцыпліна | 2 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму “Літаратурнае рэдагаванне як вучэбная дысцыпліна”. | Вусная праверка атрыманых ведаў, індывідуальная гутарка, тэсціраванне ў СДН MOODLE. |
| 2. | Рэдактар і тэкст | 2 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму “Рэдактар і тэкст”. | Вусная праверка атрыманых ведаў, індывідуальная гутарка, тэсціраванне ў СДН MOODLE. |
| 3. | Лагічныя асновы рэдагавання тэксту | 8 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму “Лагічныя асновы рэдагавання тэксту”.<br>Выканаць практычнае заданне па выпраўленні лагічных памылак, удасканаліць кампазіцыю прапанаванага тэксту. | Вусная праверка атрыманых ведаў, індывідуальная гутарка, тэсціраванне ў СДН MOODLE, праверка практычнага задання. |
| 4. | Асновы рэдактарскага аналізу тэксту | 12 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму “Асновы рэдактарскага аналізу тэксту”.<br>Выканаць практычнае заданне па тэме “Праца рэдактара над тэмай і загалоўкам”. Правесці аналіз, ацэнку і рэдагаванне фактычнага матэрыялу. | Вусная праверка атрыманых ведаў, індывідуальная гутарка, тэсціраванне ў СДН MOODLE, праверка практычнага |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | Правесці моўна-стылявую праўку матэрыялаў. Правесці сінтаксічную праўку тэксту. | задання. |
| 5. | Рэдактарская праўка і яе віды | 6 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму “Рэдактарская праўка і яе віды”. Правесці розныя віды праўкі прапанаваных тэкстаў. | Вусная праверка атрыманых ведаў, індывідуальная гутарка, тэсціраванне ў СДН MOODLE, праверка практычнага задання. |
| 6. | Знакі рэдактарскай праўкі | 4 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму “Знакі рэдактарскай праўкі”. Выправіць тэхнічныя недакладнасці прапанаваных тэкстаў, выкарыстоўваючы знакі рэдактарскай праўкі. | Вусная праверка атрыманых ведаў, індывідуальная гутарка, тэсціраванне ў СДН MOODLE, праверка практычнага задання. |
| 7. | Рэдагаванне тэкстаў розных тыпаў | 6 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму “Рэдагаванне тэкстаў розных тыпаў”. Адрэдагаваць прапанаваныя тэксты розных тыпаў. Адрэдагаваць анатацыі да студэнцкіх навуковых даследаванняў, напісаць анатацыю да навуковага артыкула. | Вусная праверка атрыманых ведаў, індывідуальная гутарка, тэсціраванне ў СДН MOODLE, праверка практычнага задання. |
| 8. | Рэдагаванне тэкстаў рознай стылявой і жанравай прыналежнасці | 4 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму “Рэдагаванне тэкстаў рознай стылявой і жанравай прыналежнасці”. Адрэдагаваць тэксты рознай стылявой і жанравай прыналежнасці. | Вусная праверка атрыманых ведаў, індывідуальная гутарка, тэсціраванне ў СДН MOODLE, праверка практычнага задання. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 9. | Рэдагаванне апарату кнігі | 2 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму “Рэдагаванне апарату кнігі”. | Вусная праверка атрыманых ведаў, індывідуальная гутарка, тэсціраванне ў СДН MOODLE |
| 10. | Афармленне і рэдагаванне бібліяграфіі | 4 | Вывучыць адпаведны матэрыял і падрыхтаваць вусны адказ на тэму “Афармленне і рэдагаванне бібліяграфіі”.<br>Адрэдагаваць прапанаваныя бібліяграфічныя апісанні.<br>Аформіць бібліяграфію да ўласнай курсавой работы. | Вусная праверка атрыманых ведаў, індывідуальная гутарка, тэсціраванне ў СДН MOODLE, праверка практычнага задання. |
| | **УСЯГО** | **50** | | |

# КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

***10 (дзесяць) балаў, залічана:***

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне, а таксама па асноўных пытаннях, якія выходзяць за яе межы;

дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні;

бездакорнае валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

выяўленая здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі;

поўнае і глыбокае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне;

уменне вольна арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку, выкарыстоўваць навуковыя дасягненні іншых дысцыплін;

творчая самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, актыўны творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

***9 (дзевяць) балаў, залічана:***

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго эфектыўна выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

здольнасць самастойна і творча вырашаць складаныя праблемы ў нестандартнай сітуацыі ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

поўнае засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку;

сістэматычная, актыўная самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, творчы ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

***8 (восем) балаў, залічана:***

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне ў аб'ёме вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны (метадамі комплекснага аналізу, тэхнікай інфармацыйных тэхналогій), уменне яго выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

здольнасць самастойна вырашаць складаныя праблемы ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку;

актыўная самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, сістэматычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

***7 (сем) балаў, залічана:***

сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх раздзелах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі (у тым ліку на замежнай мове), пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры пастаноўцы і вырашэнні навуковых і прафесійных задач;

вольнае валоданне тыпавымі рашэннямі ў рамках вучэбнай праграмы установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне, засваенне асноўнай і дадатковай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім аналітычную ацэнку;

самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, удзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

***6 (шэсць) балаў, залічана:***

дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне неабходнай навуковай тэрміналогіі, пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць абагульненні і абгрунтаваныя высновы;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры вырашэнні вучэбных і прафесійных задач;

здольнасць самастойна выкарыстоўваць тыпавыя рашэнні ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай дысцыпліне і даваць ім параўнальную ацэнку;

актыўная самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, перыядычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў.

***5 (пяць) балаў, залічана:***

дастатковыя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, пісьменны, лагічна правільны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць высновы;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры вырашэнні вучэбных і прафесійных задач;

здольнасць самастойна выкарыстоўваць тыпавыя рашэнні ў межах вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім параўнальную ацэнку;

самастойная праца на практычных, лабараторных занятках, фрагментарны ўдзел у групавых абмеркаваннях, дастатковы ўзровень культуры выканання заданняў.

***4 (чатыры) балы, залічана:***

дастатковы аб'ём ведаў у межах адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, лагічны выклад адказу на пытанні, уменне рабіць высновы без істотных памылак;

валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, уменне яго выкарыстоўваць пры вырашэнні стандартных (тыпавых) задач;

уменне пад кіраўніцтвам выкладчыка вырашаць стандартныя (тыпавыя) задачы;

уменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне і даваць ім ацэнку;

праца пад кіраўніцтвам выкладчыка на практычных, лабараторных занятках, дапушчальны ўзровень культуры выканання заданняў.

***3 (тры) балы, незалічана:***

недастаткова поўны аб'ём ведаў у рамках адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

веданне часткі асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, выклад адказу на пытанні з істотнымі, лагічнымі памылкамі;

слабое валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, некампетэнтнасць пры вырашэнні стандартных (тыпавых) задач;

няўменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і кірунках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне;

пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў.

***2 (два) балы, незалічана:***

фрагментарныя веды ў рамках адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі;

веды асобных літаратурных крыніц, рэкамендаваных вучэбнай праграмай установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне;

няўменне выкарыстоўваць навуковую тэрміналогію вучэбнай дысцыпліны, наяўнасць у адказе грубых, лагічных памылак;

пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў.

***1 (адзін) бал, незалічана:***

адсутнасць ведаў (і кампетэнцый) у рамках адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі, адмова ад адказу, адсутнасць на атэстацыі без уважлівай прычыны.

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ

па вывучаемай дысцыпліне
з іншымі дысцыплінамі спецыяльнасці

| Назва вучэбнай дысцыпліны, вывучэнне якой звязана з дысцыплінай праграмы | Кафедра, якая забяспечвае вывучэнне гэтай дысцыпліны | Прапановы кафедры аб зменах у змесце рабочай праграмы | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| “Гісторыя беларускай літаратуры XIX ст.” | кафедра беларускай і замежнай літаратуры | Пры вывучэнні тэмы “Лагічныя асновы рэдагавання тэксту” выкарыстоўваць фрагменты з твораў беларускіх пісьменнікаў | 10.05.2022 Пратакол № 10 |
| “Практыкум па беларускай мове” | кафедра мовазнаўства і лінгвадыдактыкі | Пры вывучэнні тэмы “Асновы рэдактарскага аналізу тэксту” ўлічваць агульналінгвістычныя веды студэнтаў | 21.04.2022 Пратакол № 11 |